9(476)(075.8)
Д439

# ДЗЯРЖАЎНАЕ КІРАВАННЕ І ГРАМАДСКАЕ САМАКІРАВАННЕ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

*(канец XVIII – пачатак XX ст.)*



Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

# ДЗЯРЖАЎНАЕ КІРАВАННЕ І ГРАМАДСКАЕ САМАКІРАВАННЕ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (КАНЕЦ XVIII – ПАЧАТАК XX ст.)

Рэкамендавана вучэбна-метадычным аб'яднаннем
па педагагічнай адукацыі ў якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка
для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі.
якія навучаюцца па спецыяльнасцях:
1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны;
1-02 01 02 Гісторыя і сусветная мастацкая культура;
1-02 01 03 Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа;
1-08 80 02 Тэорыя і методыка навучання і выхавання (гісторыя)

Мінск
БДПУ
2017

БІБЛІЯТЭКА БДПУ
ІНВ. № 1728045

УДК 94(476) (075.8)
ББК 63(Беи)я73
Д439

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ

Вучэбна-метадычны дапаможнік падрыхтаваны ў рамках рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2016–2020 гг. «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства» падпраграмы «Гісторыя і культура»

Аўтары:
*А. П. Жытко*, доктар гістарычных навук, прафесар;
*С. А. Талмачова*, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
*А. В. Касовіч*, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
*І. Г. Гушчынскі*, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
*А. А. Падарожняя*, кандыдат гістарычных навук;
*К. Ю. Тарановіч*, кандыдат гістарычных навук;
*Т. В. Грышкевіч*, выкладчык;
*І. М. Трасцян*, аспірант

Рэцэнзенты:
*А. Г. Каханоўскі*, доктар гістарычных навук, прафесар,
дэкан гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта;
*А. А. Цобкала*, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, намеснік
дырэктара Інстытута дзяржаўнай службы, дэкан факультэта падрыхтоўкі
і перападрыхтоўкі Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь

Д439 Дзяржаўнае кіраванне і грамадскае самакіраванне на тэрыторыі Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.) : вучэб.-метад. дапам. / А. П. Жытко [і інш.] ; пад агул. рэд. А. П. Жытко. – Мінск : БДПУ, 2017. – 320 с.
ISBN 978-985-541-372-2.

У дапаможніку асвятляюцца асноўныя праблемы фарміравання і дзейнасці мясцовых органаў дзяржаўнай улады і кіравання, а таксама саслоўнага (дваранскага, сялянскага) і бессаслоўнага (гарадскога, земскага) самакіравання на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX ст.

Адрасуецца выкладчыкам, аспірантам, магістрантам і студэнтам гістарычных факультэтаў вышэйшых навучальных устаноў.

УДК 94(476) (075.8)
ББК 63(Беи)я73

ISBN 978-985-541-372-2
© Афармленне. БДПУ, 2017

# УВОДЗІНЫ

У выніку трох падзелаў (1772, 1793, 1795 гг.) Рэчы Паспалітай паміж Расійскай, Аўстра-Венгерскай і Прускай манархіямі з карты Еўропы знікла вялікая дзяржава. Праблема Польшчы на працягу XIX – пачатку XX ст. была краевугольнай у знешнепалітычных стасунках еўрапейскіх краін.

Да Расійскай імперыі была далучана сучасная тэрыторыя Беларусі. Даследаванні гісторыі падзелаў Рэчы Паспалітай і іх наступстваў шматгранныя ў расійскай і айчыннай гістарыяграфіі. У працах дарэвалюцыйных рускіх гісторыкаў у якасці галоўнага канцэптуальнага палажэння выступаў пастулат аб непазбежнасці, заканамернасці і справядлівасці ўключэння беларускіх, украінскіх і літоўскіх зямель у склад Расійскай імперыі. У сучаснай расійскай гістарыяграфіі праводзіцца думка аб калектыўнай адказнасці манархаў Аўстрыі, Прусіі і Расіі за знішчэнне палітычнага існавання Рэчы Паспалітай.

Што тычыцца праблем новага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання беларускіх зямель і стварэння тут новых органаў улады і кіравання, то яны практычна не з'яўляліся прадметам спецыяльнага вывучэння ў айчыннай і расійскай гістарыяграфіі. Значным прабелам калектыўных манаграфій, падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па гісторыі Беларусі ў складзе Расійскай імперыі з'яўляецца адсутнасць матэрыялаў, звязаных з сістэмай мясцовых органаў улады і кіравання. У савецкай гістарыяграфіі, якая базіравалася на марксісцка-ленінскай метадалогіі, у аснове ляжаў прынцып партыйна-класавага падыходу. Пры гэтым лічылася, што органы самадзяржаўнай улады на месцах з'яўляліся рудыментам феадальнай эпохі і былі недзеяздольны мадэрнізаваць сацыяльна-эканамічныя і палітычныя працэсы. Па сутнасці, мясцовае дзяржаўнае кіраванне і грамадскае самакіраванне заставаліся практычна забароненымі тэмамі для даследаванняў. Толькі ў постсавецкі перыяд асобныя аспекты дадзенай праблемы знайшлі сваё адлюстраванне ў шэрагу манаграфій і навуковых артыкулаў. Паўстала задача стварэння вучэбна-метадычнага дапаможніка, які дасць магчымасць больш поўна зразумець усе аспекты гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст.

Удзел аўтараў дапаможніка ў рэалізацыі Дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў на 2006–2010 гг. і 2011–2015 гг. па тэмах «Эвалюцыя саслоўнага і бессаслоўнага самакіравання ў Беларусі» і «Эвалюцыя сістэмы мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання на тэрыторыі Беларусі» даў магчымасць назапасіць значны фактала-гічны матэрыял, які быў пакладзены ў аснову вучэбна-метадычнага дапаможніка.

Змест глаў дапаможніка дазволіць паглыбіць курсы: «Гісторыя Беларусі», «Гісторыя ўсходніх славян (Расія і Украіна)», «Гіста-рыяграфія гісторыі», «Крыніцазнаўства гісторыі Беларусі», спец-курса «Эвалюцыя вышэйшага саслоўя Беларусі (XIX – пачатак XX ст.)», а таксама спецкурс для асоб, якія абучаюцца на другой ступені атрымання вышэйшай адукацыі (магістратура) «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў геапалітычных працэсах (IX – пачатак XXI ст.)».

У дапаможніку зроблены спасылкі на крыніцы і навуковую літаратуру, што дазволіць выкарыстаць выкладзены матэрыял пры напісанні курсавых, дыпломных і магістарскіх дысертацый.

Вучэбна-метадычны дапаможнік «Дзяржаўнае кіраванне і гра-мадскае самакіраванне на тэрыторыі Беларусі (XVIII – пачатак XX ст.)» падрыхтаваны калектывам аўтараў у складзе А. П. Жыт-ко, С. А. Талмачовай, А. В. Касовіча, І. Г. Гушчынскага, А. А. Пада-рожняй, К. Ю. Тарановіч, Т. В. Грышкевіч, І. М. Трасцян.

А. П. Жытко

# ЗАКЛЮЧЭННЕ (А. П. Жытко)

У выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай (1772, 1793, 1795 гг.) беларускія землі ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі. Расійскія ўлады пачалі ўводзіць сістэму кіравання па ўзоры рускіх губерняў. Першапачаткова насельніцтва Беларусі вымушана было прысягнуць на вернападданства Кацярыне II. Тыя, хто адмаўляўся, вымушаны былі эмігрыраваць з краю, а іх маёмасць падлягала канфіскацыі. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел ажыццяўляўся па нормах, якія былі прадугледжаны ў заканадаўчым акце «Учреждения для управления губерний Всероссийской империи» ад 7 лістапада 1775 г. На беларускіх землях ствараліся губерні (з 1778 па 1796 г. – намесніцтвы), назвы і тэрыторыя якіх мянялася да 1801 г. З пачатку XIX ст. тэрыторыя Беларусі была ўключана ў 5 губерняў – Віленскую, Віцебскую, Гродзенскую, Магілёўскую і Мінскую. Губерні ў сваю чаргу падзяляліся на паветы, а паветы – на станы (з 1837 г.). У сувязі з рэформай П. Кісялёва, а пазней (1861–1867 гг.) рэформамі, якія тычыліся памешчыцкіх, удзельных і дзяржаўных сялян, ствараліся болын дробныя адміністрацыйныя адзінкі – воласці і сялянскія грамады. Такім чынам, да канца 1870-х гг. практычна закончылася адміністрацыйна-тэрытарыяльнае ўладкаванне Беларусі. Амаль без істотных змен адміністрацыйныя адзінкі захаваліся да 1917 г.

Беларускія губерні атрымалі статус аддаленых і да 1856 г. уваходзілі ў склад розных генерал-губернатарстваў. Да 1912 г. захавалася Віленскае генерал-губернатарства, якое складалі Віленская, Гродзенская і Ковенская губерні. Канкрэтнымі губернямі кіравалі грамадзянскія губернатары. Аднак падчас паўстанняў ці напружанай палітычнай сітуацыі іх абавязкі пераходзілі ў рукі ваенных губернатараў. Для выканання функцый па кіраванні губернямі ў распараджэнні губернатараў былі губернскія праўленні, органы паліцыі і жандармерыі.

Абсалютную большасць насельніцтва Расійскай імперыі, у тым ліку і Беларусі, складала саслоўе сельскіх абывацелей (сяляне). Для кіравання гэтай саслоўнай групай і рэалізацыі аграрнай палітыкі самадзяржаўя ўводзіўся інстытут міравых пасрэднікаў, губернскія і павятовыя па сялянскіх справах установы, земскія начальнікі.

У адпаведнасці з рэформай 1775 г. самай важкай адміністрацыйна-гаспадарчай і фінансавай установай, якая ведала падатко-

вай справай, прыбыткамі і выдаткамі казённых сродкаў, у губерні з'яўлялася казённая палата, а ў павеце – казначэйства. З 1851 г. пытанні падаткаабкладання вырашаліся ў губернскіх камітэтах па земскіх павіннасцях і па земскіх павіннасцях прысутнасцях.

У другой палове XIX ст. урад правёў шэраг фінансавых рэформ, у выніку чаго былі створаны разнастайныя падатковыя органы пры казённых палатах. Гэта прывяло да аптымізацыі падатковай сферы і дадатковых паступленняў грашовых сродкаў.

Для кіравання дзяржаўнай гаспадаркай і дзяржаўнымі сялянамі з канца 1839 г. былі створаны палаты (з 1866 г. – праўленні) дзяржаўных маёмасцей. У 1873 г. функцыі гэтых органаў у Беларусі былі пашыраны, калі да іх перайшлі справы аб канфіскаваных маёнтках.

З мэтай практычнай рэалізацыі сталыпінскай аграрнай рэформы былі створаны губернскія і павятовыя землеўпарадкавальныя камісіі. Галоўнымі кірункамі іх дзейнасці былі: садзейнічанне ў набыцці сялянамі купчай зямлі, стварэнне хутарскіх і адрубных гаспадарак, ліквідацыя цераспалосіцы, аказанне агранамічнай і ветэрынарнай дапамогі, перасяленне сялян на свабодныя казённыя землі ў Сібіры і на Далёкім Усходзе.

У адпаведнасці з «Учреждениями для управления губерний...» 1775 г. была створана сістэма мясцовых бессаслоўных і саслоўных судоў. Губернскія палаты крымінальнага і грамадзянскага суда, Верхні земскі суд, губернскі магістрат, Верхняя расправа, павятовыя суды, гарадавыя магістраты і ратушы, ніжнія расправы, «совестныя» і славесныя суды. На тэрыторыі Беларусі дадзеныя судовыя ўстановы пры вырашэнні грамадзянскіх спраў выкарыстоўвалі нормы III Статута ВКЛ і некаторыя пастановы Сейма Рэчы Паспалітай. У прыватнасці, да 1840 г. у беларускіх губернях дзейнічаў інстытут адвакатуры.

Разам з тым, гэта сістэма была даволі грувасдкай, а некаторыя судовыя ўстановы былі саслоўнымі і дубліравалі функцыі. У аснову судовай рэформы 1864 г. былі закладзены бессаслоўныя, дэмакратычныя прынцыпы судаўладкавання і судаводства. У сувязі з наступствамі паўстання 1863–1864 гг. стварэнне новай судовай сістэмы праводзілася з вялікім спазненнем і ў два этапы. З 1872 г. уводзіліся міравыя, а з 1883 г. – акруговыя суды. Акрамя гэтага, міравыя суддзі ў краі не выбіраліся, а прызначаліся ад урада. Быў і шэраг іншых абмежаванняў. Нягледзячы на дадзеныя акалічнасці, гэта быў чарговы крок на шляху фарміравання грамадзянскай супольнасці.

Важную ролю ў сістэме мясцовага кіравання адыгрывалі органы саслоўнага (дваранскага, сялянскага) і бессалоўнага (гарадскога, земскага) самакіравання.

На падставе «Жалованной грамоты на права, вольности и преимущества благородного российского дворянства» ад 21 красавіка 1785 г. была створана дваранская карпарацыя. Вышэйшае саслоўе атрымала пэўнае самакіраванне, павятовую і некаторую частку губернскай улады. Пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі такія ж правы былі нададзены і набілітэту Беларусі.

Закон прадугледжваў пагубернскую арганізацыю вышэйшага саслоўя. Вышэйшымі распарадчымі органамі таварыстваў з'яўляліся губернскія і павятовыя сходы. Усе вышэйшыя карпаратыўныя справы вырашаліся на губернскіх сходах. На іх заслухоўваліся справаздачы аб выкананні прынятых раней пастаноў, зацвярджаліся зборы на прыватныя дваранскія патрэбы, выбіраліся ўсе службовыя асобы карпаратыўных органаў: губернскія і павятовыя прадвадзіцелі, дэпутаты і сакратары дваранскіх дэпутацкіх сходаў, засядацелі дваранскіх апек, кандыдаты для замяшчэння шэрагу каронных пасад па мясцовым кіраванні. Ім належала права – і гэта лічылася адной з важнейшых прывілей – падаваць праз губернскіх прадвадзіцелей ці дэпутатаў прашэнні ці скаргі губернскаму начальству, міністрам і непасрэдна імператару.

У паўночна-заходніх губернях апошнія выбары на павятовых і губернскіх дваранскіх сходах прайшлі ў канцы 1858 – пачатку 1859 г. Наступныя павінны былі адбыцца ў снежні 1861 і ў студзені 1862 г. Але ў сувязі з хваляваннямі сярод дваранства рымска-каталіцкага веравызнання, якія складалі тут абсалютную большасць у параўнанні з прадстаўнікамі іншых канфесій, з 1861 г. адтэрміноўваліся дваранскія выбары ў Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай губернях па прычыне пераводу іх на ваеннае становішча.

Праблема выбараў у заходніх губернях неаднаразова абмяркоўвалася ва ўрадавых колах. Аднак да канца існавання самадзяржаўя дваранская карпарацыя з выбарным пачаткам не была адноўлена.

У 1797 г. Павел І увёў самакіраванне ў паселішчах удзельных (былых дварцовых) сялян. У гэтым жа годзе Палажэнне аб кіраванні ўдзельнымі сялянамі з некаторымі зменамі было распаўсюджана і на дзяржаўных сялян. Так быў пакладзены пачатак юрыдычнаму ўладкаванню сельскай грамады.

Пасля абвяшчэння Маніфеста 19 лютага 1861 г. прыгонныя сяляне атрымалі асабістую свабоду. Яны афіцыйна набылі права на стварэнне саслоўнага самакіравання на ўзроўні сельскай грамады і воласці. Менавіта стварэнне органаў сялянскага самакіравання было адным з інструментаў правядзення рэформы, а таксама з'яўлялася гарантам як правоў, так і абавязкаў сялян.

У створанай структуры сялянскага самакіравання знайшлі сваё ўвасабленне як традыцыйныя формы арганізацыі сялянскага жыцця (сельскія грамады), так і новыя (воласці), якія адлюстравалі імкненне царскіх улад забяспечыць над імі дзейсны адміністрацыйны кантроль пры мінімальных фінансавых выдатках. У гэтым кірунку праводзіліся і ўсе далейшыя рэарганізацыі сістэмы сялянскага самакіравання і кантролю над ім. Далейшыя распараджэнні, цыркуляры і інш. акты ўзмацнялі афіцыйны бок жыцця валасцей і сельскіх грамад. Менавіта ў парэформенны перыяд быў пакладзены пачатак працэсу атаясамлення сялянамі, з аднаго боку, сельскай грамады з адзінкай сапраўднага самакіравання, а, з другога боку, воласці – толькі з адміністрацыйнай адзінкай. У далейшым гэта прывяло да змяншэння актыўнасці большасці сялян пры ўдзеле ў валасных сходах, чым у сельскіх.

У 60-х гг. XIX ст. абсалютную большасць сельскага насельніцтва складалі сяляне. Аднак з развіццём капіталізму на тэрыторыі воласці пасяліліся рабочыя, прадстаўнікі іншых класаў і саслоўяў, якія набывалі зямлю, засноўвалі прамысловыя і гандлёвыя прадпрыемствы. У выніку воласць паступова пераўтварылася ў адзінку, якая вымушана была абслугоўваць інтарэсы не толькі сялян, а ўсяго сельскага насельніцтва на сваёй тэрыторыі. Аднак грошы на ўтрыманне органаў валаснога самакіравання выдаткоўваліся выключна сялянамі. Таму ў пачатку XX ст. паўстала праблема не толькі ўвядзення ў краі земскага самакіравання, але і стварення ніжэйшай земскай адзінкі – валаснога бессаслоўнага земства.

У адпаведнасці з Даравальнай граматай гарадам 1785 г. на тэрыторыі Беларусі былі створаны саслоўныя органы гарадскога самакіравання. Аднак у сувязі са значнымі сацыяльна-эканамічнымі зменамі, ростам гарадскога насельніцтва і павелічэннем маштабаў гарадскіх праблем, асабліва ў значных адміністрацыйна-прамысловых цэнтрах, падштурхнулі царскі ўрад увесці Гарадавое палажэнне 1870 г., у адпаведнасці з якім былі створаны дзеяздольныя органы бессаслоўнага гарадскога самакіравання. Бессаслоўны прынцып арганізацыі органаў гарадскога самакіравання заклаў асновы фар-

міравання грамадзянскай супольнасці. Па законе дастаткова было валодаць любой нерухомай маёмасцю ў межах горада, утрымліваць гандлёвыя ці прамысловыя ўстановы альбо мець прамысловае пасведчанне на права займацца гандлем, промыслам ці рамяством, каб атрымаць выбарчае права. Уведзеныя маёмасны і гандлёва-прамысловыя цэнзы садзейнічалі таму, што ў гарадах выбаршчыкі амаль на 70 % складаліся з прадстаўнікоў гандлёва-прамысловай праслойкі. Пасіўнае выбарчае права атрымалі і жанчыны, якія прымалі ўдзел у выбарах праз давераных асоб з адпаведным натарыяльна афармленым дакументам.

У пачатку XX ст. галоўная роля ў дзейнасці гарадскіх дум належала людзям, якія звычайна мелі вышэйшую адукацыю, што давала магчымасць прафесійна падыходзіць да вырашэння шматлікіх гарадскіх праблем. Калі да ўвядзення Палажэння 1870 г. удзел прадстаўнікоў прывілеяваных саслоўяў у органах гарадскога самакіравання лічыўся пагардным, то пасля правядзення рэформы, асабліва ў пачатку XX ст., непрыманне выбарнай службы вышэйшай часткай грамадства змянілася яе актыўным удзелам. У сукупнасці з іншымі рэформамі саслоўе гарадскіх абывацелей называлася так толькі фармальна. У яго асяроддзі паступова пачалі фарміравацца класы буржуазнага грамадства. У выніку была створана рацыянальная і працаздольная сістэма органаў гарадскога самакіравання, якая адпавядала тагачасным запатрабаванням.

Земская рэформа ў Расійскай імперыі праводзілася з 1864 г. Думка аб неабходнасці ўтварэння асобных органаў мясцовага самакіравання ўзнікла адначасова са складаннем палажэнняў аб вызваленні сялян ад прыгоннай залежнасці. Па ўказе імператара ад 23 кастрычніка 1859 г. пачалася падрыхтоўка праекта аб увядзенні земскага самакіравання на ўзроўні губерні і павета. Пасля яго абмеркавання ў Савеце міністраў і зацвярджэння Аляксандрам II у 1862 г. Палажэнне аб земскіх установах было надрукавана для агульнага азнаямлення.

1 студзеня 1864 г. Палажэнне аб земскіх установах набыло сілу закона. На працягу 1865–1876 гг. земствы былі ўведзены ў 34 губернях еўрапейскай Расіі і ў вобласці Войска Данскога. Ва ўмовах паўстання 1863–1864 гг., знаходжання тэрыторыі Беларусі на ваенным становішчы Палажэнне аб земствах на заходнія губерні не распаўсюджвалася. Тлумачылася гэта тым, што земствы ўяўлялі сабой дзяржаўны інстытут, які грунтаваўся на выбарным пачатку і ў пэўнай ступені даваў магчымасць праявіцца грамадскай самастойнас-

ці. Механізм выбараў у земскія ўстановы быў абумоўлены маёмасным цэнзам і забяспечваў перавагу памеснага дваранства. У той жа час царскі ўрад пасля паўстання 1863–1864 гг. праводзіў палітыку эканамічнага падрыву «польскага» памеснага дваранства, на долю якога прыпадала звыш 90 % прыватнай зямельнай уласнасці.

Толькі з канца XIX ст. урад неаднаразова абмяркоўваў пытанне аб увядзенні земстваў у заходніх губернях. 14 сакавіка 1911 г. быў прыняты ўказ аб распаўсюджанні дзеяння Палажэння аб земскіх установах на Віцебскую, Валынскую, Кіеўскую, Мінскую, Магілёўскую і Падольскую губерні. Такім чынам, толькі ў трох беларускіх губернях уводзіліся земскія ўстановы па ўзоры 1890 г., але з некаторымі змяненнямі і дапаўненнямі. Замест саслоўных курый (сялянскай і памешчыцкай) уводзіліся курыі нацыянальныя – «руская» і «польская». У «рускую» ўключалася праваслаўнае насельніцтва, а ў «польскую» – каталіцкае. Дзеля забеспячэння перавагі ў земстве за рускімі памешчыкамі пры размеркаванні выбаршчыкаў бралося сярэдняе арыфметычнае колькасці «рускага» і «польскага» насельніцтва і кошт іх нерухомай маёмасці (у працэнтах). У Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губернях не толькі дваранства, але і сялянства было ў асноўным каталіцкага веравызнання. Пры такой сістэме падліку ўсё роўна пераважала б «польская» курыя. З гэтай прычыны земствы ў названых губернях не ўводзіліся.

За кароткі тэрмін органы самакіравання правялі значную работу па рэалізацыі сталыпінскай аграрнай рэформы, пад'ёме сельскагаспадарчай вытворчасці, пашырэнні адукацыі, ахове здароўя насельніцтва. Некаторыя з земскіх дзеячаў актыўна ўдзельнічалі ў дзейнасці IV Дзяржаўнай думы.

# ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ (А. П. Жытко) ... 3

**Глава І. ГІСТАРЫЯГРАФІЯ І КРЫНІЦЫ** ... 5

1.1. Гістарыяграфія праблемы (А. П. Жытко, А. В. Касовіч, С. А. Талмачова, А. А. Падарожняя) ... 5

1.2. Характарыстыка крыніц (А. П. Жытко, С. А. Талмачова, А. А. Падарожняя) ... 26

**Глава ІІ. АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ТЭРЫТАРЫЯЛЬНЫ ПАДЗЕЛ БЕЛАРУСІ** ... 33

2.1. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел беларускіх зямель (1772–1796 гг.) (А. П. Жытко, С. А. Талмачова) ... 33

2.2. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел у 1796–1870-я гг. (А. П. Жытко, С. А. Талмачова) ... 41

**Глава ІІІ. МЯСЦОВЫЯ ОРГАНЫ ЎЛАДЫ** ... 46

3.1. Генерал-губернатары і губернатары (А. П. Жытко, А. А. Падарожняя, С. А. Талмачова, І. М. Трасцян) ... 46

3.2. Губернскія праўленні (А. П. Жытко, С. А. Талмачова) ... 64

3.3. Органы паліцыі і жандармерыі (А. П. Жытко, С. А. Талмачова, А. А. Падарожняя) ... 69

**Глава IV. ОРГАНЫ КІРАВАННЯ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ АГРАРНАЙ ПАЛІТЫКІ І АПЕКІ НАД СЯЛЯНАМІ** ... 82

4.1. Міравыя пасрэднікі (А. П. Жытко, С. А. Талмачова) ... 82

4.2. Губернскія і павятовыя па сялянскіх справах прысутнасці (С. А. Талмачова) ... 91

4.3. Земскія начальнікі (С. А. Талмачова) ... 95

**Глава V. ГАСПАДАРЧА-ФІНАНСАВЫЯ ОРГАНЫ** ... 101

5.1. Казённыя палаты (А. П. Жытко, С. А. Талмачова) ... 101

5.2. Губернскія па земскіх павіннасцях прысутнасці (А. П. Жытко, С. А. Талмачова) ... 103

5.3. Падатковыя камісіі (А. П. Жытко, С. А. Талмачова) ... 107

**Глава VI. ОРГАНЫ КІРАВАННЯ ДЗЯРЖАЎНЫМІ МАЁМАСЦЯМІ. ГУБЕРНСКІЯ І ПАВЯТОВЫЯ ЗЕМЛЕЎПАРАДКАВАЛЬНЫЯ КАМІСІІ** ........ 109

6.1. Кіраванне дзяржаўнымі маёмасцямі (А. П. Жытко, С. А. Талмачова) ........ 109

6.2. Дзейнасць землеўпарадкавальных камісій па рэалізацыі сталыпінскай аграрнай рэформы (А. П. Жытко, С. А. Талмачова, К. Ю. Тарановіч) ........ 112

**Глава VII. ЭВАЛЮЦЫЯ СУДОВАЙ СІСТЭМЫ** ........ 119

7.1. Судовыя ўстановы ў краі (1775–1872 гг.) (І. Г. Гушчынскі, А. П. Жытко, С. А. Талмачова) ........ 119

7.2. Асаблівасці рэалізацыі судовай рэформы 1864 г. у Беларусі (І. Г. Гушчынскі) ........ 130

**Глава VIII. САСЛОЎНАЕ І БЕССАСЛОЎНАЕ САМАКІРАВАННЕ Ў БЕЛАРУСІ** ........ 144

8.1. Дваранскае самакіраванне (А. П. Жытко) ........ 144

8.2. Органы сялянскага самакіравання (С. А. Талмачова) ........ 153

8.3. Гарадское самакіраванне (Т. В. Грышкевіч, А. П. Жытко, С. А. Талмачова) ........ 163

8.4. Земскае самакіраванне (С. А. Талмачова) ........ 181

ЗАКЛЮЧЭННЕ (А. П. Жытко) ........ 200

ПРЫКЛАДЫ ТЭСТАВЫХ ЗАДАННЯЎ ........ 206

ЛІТАРАТУРА ........ 208

ДАДАТКІ ........ 211